На экранах

# ШОУ НЕ ПАВІННА ПРАЦЯГВАЦЦА

## Цяпер музыку Queen можна паслухаць з вялікага экрана

У кінатэатрах з поспехам паказваецца карціна пра Фрэдзі Мерк'юры і гурт Queen «Багемская рапсодыя», дзе ўсё жыццё Мерк'юры аддадзена ў ахвяру канвенцыям кіно. Самаўпэўнены хлопец трапляе ў бэнд, на першым канцэрце яго не прымаюць, гурт становіцца паспяховым, галоўны герой руйнуе сваё жыццё, нарэшце шчаслівая вяртаецца ў каманду — класічная схема ў суправаджэнні пафасных фраз. Ці то «заснавана на рэальных падзеях», ці то банальная карціна. Ці ёсць тут некаму справа да ўласна Фрэдзі Мерк'юры альбо ён патрэбны, каб прадаць білеты на фільм, яшчэ пытанне.



«Багемская рапсодыя» (хаця правільней было б перакласці «Багемная рапсодыя») будуецца на добра вядомай і заезджанай схеме гісторый поспеху і яго адваротнага боку. З невялікімі адхіленнямі, якія акрэсліваюць факты з жыцця Мерк'юры, аўтары знялі вельмі традыцыйнае кіно. Мы такое бачылі ўжо сто разоў, але тут прынамсі гучыць шмат музыкі, і не якой-небудзь, а музыкі Queen. (Дзеля гэтых матываў, «Багемскай рапсодыі» і Мерк'юры на фільм і ідуць.)

Такім чынам, мы бачым хлопца з Занзібара, якога называюць пакістанцам і які саромеецца свайго паходжання. Ён далучаецца да студэнцкага гурта ў якасці саліста і хутка выступае з самаўпэўненымі і дзёрзкімі прапановамі, якія, канешне ж, прыводзяць Queen да поспеху. Потым ён расстаецца з жонкай, таму што гомасексуаліст. Потым кідае гурт і акружае сябе дрэннымі людзьмі, пакутуючы ад адзіноты. Потым выяўляецца, што ён ВІЧ-дадатны. Нарэшце, ён разумее, што нешта не так, і вяртаецца да сваёй «сям'і», гэта значыць да Queen.

З аднаго боку, схема жыцця Фрэдзі Мерк'юры праўдзівая. А з іншага, зрабіць больш кіношна абыграную біяграфію было складана. Усё падладжваецца, даціскаецца, недаціскаецца, асентыментальваецца, скажаецца пад драматургічныя хады трывіяльных сюжэтаў. Бацька Мерк'юры ў пачатку фільма нешчаслівы з сынам, а ў канцы яго моцна абдымае, што азначае прызнанне. Выпадковы абаяльны мужчына пасля адной з вечарын кажа Фрэдзі, каб той знайшоў яго, калі палюбіць сябе, — і Мерк'юры, канешне, знаходзіць, і яны тут жа едуць да бацькоў галоўнага героя. Калегі Фрэдзі па гурце праяўляюць сваю нелюбоў да яго акружэння, і гэта становіцца прадвесцем вялікага крызісу. У крытычны момант да Фрэдзі завітвае яго былая жонка, і пасля яе спіча пад дажджом Мерк'юры ўсё разумее і сыходзіць да лепшых рашэнняў.

Я ўжо не кажу пра банальнасць абыгрывання асобных сцэн, што рэальнасці наўрад ці адпавядаюць, пра сентыментальнасць, пра жыццесцвярджальныя выразы, пра рашэнні насуперак традыцыям як рэцэпт поспеху — усё гэта ідзе наперадзе ўласна гісторыі жыцця. Інтарэсы кіно наперадзе рэальных турбот, адзіноты і пачуццяў Фрэдзі Мерк'юры. На месца галоўнага героя можна было паставіць іншага персанажа, але, праўда, іншы не прыцягнуў бы столькі гледачоў. Колькі фанатаў рынулася ў кінатэатры, складана ўявіць, але баюся, атрымліваюць яны ардынарны фільм пра неардынарнага чалавека.

Што можна зрабіць падчас прагляду, дык гэта паслухаць уплечення ў сюжэт песні Queen з вялікага экрана. Як стваралася Bohemian Rhapsody, як гурт прыдумаў We Will Rock You, як прагучала We Are the Champions на канцэрце Live Aid, дзе публіка лавіла кожны рух Мерк'юры. Хоць карціна абмежавала сябе канонамі і камерцыйнымі задачамі, яе галоўную вартасць і сапраўднае натхненне — песні — аўтары «Багемскай рапсодыі», здаецца, разумеюць і даюць гледачам добрую іх дозу. Знаёмыя матывы, саўндтрэкі, фонавае гучанне і, нарэшце, канцэрт у якасці фіналу (за ім, канешне ж, сочаць усе астатнія героі), дзе адна за другой ледзь не ў «рэжыме live» выконваюцца знакамітыя песні з пазнавальнымі рухамі, позамі і манерай Мерк'юры, крышку рэабілітуюць гэты фільм.

Рамі Малек, што з накладной сківіцай выканаў галоўную ролю, добра ўпісаўся ў стылістыку карціны, але сыграў нейкае бачанне Мерк'юры, у якім няма ні вядомай закрытасці спевака, ні яго сціпласці, ні надрыву, ні маштабу, ні нават адзіноты, што аўтары хацелі перадаць. Уся ўвага на вусны.

Карціна па ўсім свеце збірае ў кінатэатрах аматараў «Багемскай рапсодыі» — але тут няма Фрэдзі Мерк'юры, а ёсць толькі кіношны герой, няма гурта Queen, а ёсць гісторыя поспеху, няма вышыні палёту, пазачасовасці і ўздыму, а толькі эрзацы і патэрны. Адзінае вечнае, што ёсць у фільме, — музыка Queen. Такое шоу не павінна працягвацца.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

# СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.49 | 17.01 | 8.12 |
| Віцебск — | 8.45 | 16.45 | 8.00 |
| Магілёў — | 8.39 | 16.51 | 8.12 |
| Гомель — | 8.29 | 16.55 | 8.26 |
| Гродна — | 9.04 | 17.18 | 8.14 |
| Брэст — | 8.57 | 17.25 | 8.28 |

### Месяц

*Першая квадра 15 лістапада.*

*Месяц у сузор'і Цяльца.*

### Імяніны

***Пр.** Матроны, Аляксандра, Аляксея, Антона, Кірылы, Парфірыя.*

***К.** Цэцыліі, Маркa, Сцяпана.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

### 22 ЛІСТАПАДА

**У краіне**

**1876** год — нарадзіўся (г. Гродна) Зіновій Пятровіч Салаўёў, адзін з арганізатараў аховы здароўя ў СССР. У 1918—1920 гадах намеснік народнага камісара аховы здароўя РСФСР. З 1920-га — начальнік Галоўнага ваенна-санітарнага ўпраўлення Чырвонай Арміі, старшыня Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца. Аўтар навуковых прац па пытаннях тэарэтычных асноў аховы здароўя, вышэйшай медыцынскай адукацыі, гісторыі медыцыны, ваенна-санітарных спраў. Па яго ініцыятыве ў 1925 годзе створаны піянерскі лагер «Артэк». Памёр у 1928 годзе.

**1893** год — нарадзіўся (в. Бяседавічы, цяпер у Хоцімскім раёне) Іван Захаравіч Сурта, педагог, дзяржаўны дзеяч Беларусі, акадэмік НАН Беларусі. У 1933—1936 гадах наркам аховы здароўя Беларусі, у 1936—1937 гадах — прэзідэнт АН Беларусі. Аўтар навуковых прац па пытаннях метадалогіі і гісторыі прыродазнаўства. У 1937 годзе быў арыштаваны і прыгавораны да выключнай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1956 годзе.

**1913** год — нарадзіўся (в. Гарадзецк, цяпер у Дрыбінскім раёне) Міхаіл Васілевіч Аўдзееў, генерал-маёр авіяцыі, Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1941 года. Камандзір авіяэскадрыллі ВПС Чарнаморскага флоту капітан М. Аўдзееў вызначыўся пры абароне Севастопаля, дзе ў паветраных баях збіў шэсць самалётаў праціўніка. Усяго за гады вайны збіў 17 самалётаў. Да 1964 года служыў у Савецкай Арміі. Памёр у 1979 годзе.

**У свеце**

**1890** год — нарадзіўся Шарль Андрэ Жазэф Мары дэ Голь, французскі дзяржаўны, палітычны і ваенны дзеяч, генерал, заснавальнік і прэзідэнт Пятай Рэспублікі (1958). Памёр у 1970 годзе.



**1906** год — выдадзены ўказ аб выхадзе сялян з абшчыны — пачатак Сталыпінскай аграрнай рэформы.

**1941** год — падчас блакады фашысцкімі войскамі Ленінграда была адкрыта «Дарога жыцця», якая звязала абложаны горад з Вялікай зямлёй. Першая калона з 60 аўтамашын з санкамі на прычэпах адправілася па лёдзе на ўсходні бераг Ладажскага возера і да вечара дасягнула порта Кабона. За час дзеяннняў лядовай трасы з тылу ў блакадны горад былі дастаўлены сотні тон грузаў.

**1955** год — на Сяміпалацінскім палігоне было ўзарвана першае двухступеньчатае тэрмаядзернае ўстройства — баявы варыянт вадароднай бомбы. Савецкія вучоныя адкрылі прынцыпы тэрмаядзернай зброі.

## УСМІХНЕМСЯ

Фіма, Вова і Мікола сабраліся перанесці мэблю. Калі Вова і Мікола з цяжкасцю цягнулі ўверх па лесвічным пралёце дубовы гардэроб, Вова заўважыў, што Фіма кудысьці знік.

— А дзе Фіма? Чаму ён не дапамагае?

— Ён дапамагае, — адказаў Мікола. — Ён унутры, вешае на месца кручкі.

**Спакойна стаўлюся да таго, што мая дзяўчына феміністка.**

**Абы гатавала, мыла і прыбірала.**

— Мама, я брацiка хачу.

— Добра, будзе табе брацік.

— Алё, тата, я дамовіўся — будзе ў цябе сёння ўвечары секс. З цябе барабан і фламастары!

**Кемлівая дзяўчына плача ў ванным пакоі, там выдатная акустыка.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4172.

Нумар падпісаны ў 19.30 21 лістапада 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12